ВЕСЦІ АКАДЭМІІ АГРАРНЫХ НАВУК БЕЛАРУСІ
№ 3 1995

# *ГАДАВЫ АГУЛЬНЫ СХОД АКАДЭМІІ АГРАРНЫХ НАВУК БЕЛАРУСІ*

*В. С. АНТАНЮК*

## ВЫВАДЫ, ЯКІЯ ВЫЦЯКАЮЦЬ З ВОПЫТУ ПРАЦЫ АКАДЭМІІ АГРАРНЫХ НАВУК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Шматвяковы вопыт сведчыць пра тое, што толькі стваральная і творчая дзейнасць чалавека гарантуе прагрэс грамадства, дабрабыт яго членаў, незалежнасць краіны. Нармальна развівацца можа толькі тая дзяржава, якая забяспечвае нацыянальную харчовую бяспеку. Адсюль задача самазабеспячэння рэспублікі прадуктамі харчавання і сыравінай з улікам эканамічнай мэтазгоднасці іх вытворчасці павінна быць прыярытэтнай. Значыць, стварэнне для аграпрамысловага комплексу і яго авангарда — навукі рэжыму спрыяння — найпершы абавязак дзяржавы.

Калі зараз не зрабіць захады па прыпыненні падзення аграпрамысловай сферы, эканоміка рэспублікі стане на грань неўзнаўляльнага разбурэння жыццёва важнай галіны. Гаворка ідзе не пра аказанне беззваротнай дапамогі сялу, а пра пратэкцыянізм з боку дзяржавы селяніну, пра партнёрскія дачыненні паміж імі. Сёння без стабільнага набыцця гаспадаркамі матэрыяльна-энергетычных рэсурсаў, выкарыстання высокапрадукцыйнага пасяўнога і племяннога матэрыялу, энергарэсурсазберагальных тэхналогій, без парытэту цэн, без правядзення гнуткай фінансава-крэдытнай палітыкі не выправіць становішча. Праводзімыя ў такім выпадку рэформы будуць мёртвымі, іх чакае забыццё, а вытворчасць — разбурэнне.

Звяртаючыся да цывілізаваных вытокаў развіцця земляробства ў рэспубліцы, неабходна адзначыць, што беларуская зямля заўсёды была спрыяльнай для развіцця сельскагаспадарчай навукі. Менавіта яна 155 гадоў таму прыняла першапраходцаў сельскагаспадарчай навукі Расіі — Горы-Горацкую земляробчую навучальную ўстанову, якая вырасла потым у Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Няма неабходнасці даказваць спрыяльнае ўздзеянне навуковай думкі на развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці. Вось толькі некаторыя факты: тады сярэдняя прадукцыйнасць выкарыстоўваемай зямлі складала толькі каля пяці, а ў цяперашні час — больш за 30 ц/га. На адзінку прадукцыі затрачвалася 25 гадз, а ў 1990 г.— толькі каля 1 гадз.

Значна ўзрос навуковы патэнцыял аграпрамысловага комплексу рэспублікі. Толькі ў складзе Акадэміі аграрных навук знаходзіцца 27 навукова-даследчых устаноў, забяспечаных высокапрафесійнымі кадрамі. Навуковая база ствараласяя гадамі для вырашэння важнейшых праблем развіцця вытворчасці. Знаходзячыся на стыку Усход—Захад, яна ўвабрала ўсё лепшае ў гэтых вектарах дзейнасці чалавецтва, ствараючы сваю прафесійную школу вучоных.

Не змяняючы ў прынцыпе стратэгічнага накірунку навуковага пошуку, які нацэлены на павышэнне генетычнага патэнцыялу сельскагаспадарчых раслінаў і жывёл, пашыранае ўзнаўленне ўрадлівай сілы зямлі, эфектыўнай аддачы ад укладзенай мінулай і жывой працы, г. зн. прыярытэтных пазіцый і ключавых элементаў мэтавай праграмы «Агракомплекс», раздзелы якой выконваюцца і ў бягучым годзе, навуковыя ўстановы Акадэміі аграрных навук у канкрэтнай сітуацыі эканамічнага ста-

ну гаспадарак, дэфіцыту жыццёва важных рэсурсаў, абаротных сродкаў адной з галоўных сваіх задач вызначылі ўдакладненне тактычных рашэнняў навуковага забеспячэння мераў папярэджання зніжэння ўзроўню вытворчасці, яе стабілізацыі. Пра правільнасць выбару накірункаў навукова-даследчай дзейнасці сведчаць атрыманыя вынікі.

За чатыры апошнія гады ў выніку выканання рэспубліканскай навукова-тэхнічнай праграмы «Агракомплекс» раяпавана больш за 30 сартоў сельскагаспадарчых культур; распрацаваны шэраг прагрэсіўных глебаахоўных тэхналогій вырошчвання сельскагаспадарчых культур, новыя формы ўгнаенняў, тэхналогія вытворчасці і выкарыстання біялагічных сродкаў аховы раслінаў; створана папуляцыя высокапрадукцыйнай жывёлы чорна-пярэстай пароды колькасцю больш за 2000 кароў з сярэднім гадавым надоем больш за 6000 кг малака і высокай колькасцю сухога рэчыва. Выгадаваны селекцыйныя групы мясной жывёлы, свіней, авечак з высокай канверсіяй кармоў; распрацаваны доследныя серыі новых вакцын і лекава-прафілактычных прэпаратаў. Для патрэб практычнай ветэрынарыі рэспублікі выраблена і рэалізавана 20 прэпаратаў агульнай колькасцю больш за 29 млн дозаў.

У вобласці механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі распрацавана і пастаўлена на серыйную вытворчасць 14 машын. Шэраг навуковых прац выкананы вучонымі-эканамістамі і спецыялістамі ў вобласці перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі.

Выкарыстанне навуковых распрацовак у вытворчасці дазваляе ў сучасных умовах крызіснай сітуацыі ў эканоміцы рэспублікі затрымаць абвальнае падзенне сельскагаспадарчай вытворчасці.

Патэнцыял высокапрадукцыйных сартоў раслінаў, тыпаў жывёл, тэхнічных сродкаў, біяветпрэпаратаў, рэсурсазберагальных тэхналогій, якія мае рэспубліка, немалы. Напрыклад, пашырэнне пасеваў новых сартоў азімай пшаніцы з ураджайнасцю 70 ц/га дазваляе да мінімуму звесці завоз харчовага зерня з-за мяжы. У сучасны момант парадку 70% пасяўных плошчаў збожжавых і 80% бульбы ў рэспубліцы занята сартамі беларускай селекцыі. Толькі ў 1993 г. па ўлічаных даных новыя сарты збожжавых далі прыбаўку ўраджаю ў рэспубліцы 280 000 т. На вытворчасці гэтай колькасці збожжа зэканомлена больш за 13 000 т паліва, 17 000 т мінеральных угнаенняў у дзеючым рэчыве, а таксама іншыя рэсурсы.

За распрацоўку метадаў і вынікаў селекцыі высокаўраджайных рэсурсаэканамічных сартоў яравога ячменю і азімага жыта пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь прысуджана Дзяржаўная прэмія ў галіне навукі і тэхнікі за 1994 г. акадэміку С. І. Грыбу, дактарам сельскагаспадарчых навук М. А. Кадыраву, М. Дз. Мухіну, кандыдатам навук В. І. Рубану, С. Д. Лаўруковіч, І. І. Мельнік.

Адзначаныя распрацоўкі вучоных далёка не вычэрпваюць наяўныя магчымасці, а толькі пацвярджаюць той патэнцыял, які павінен быць паўсюдна задзейнічаны. Выкарыстанне яго разам з дзяржаўнай падтрымкай дазволіць вярнуць былую славу сельскагаспадарчай вытворчасці Беларусі, забяспечыць народ якаснымі прадуктамі харчавання, вывесці рэспубліку ў рад экспартназдольных дзяржаў.

Эфектыўнасць жа навуковых распрацовак вялікая. Толькі па адной дзяржаўнай праграме «Урадлівасць» у мінулым годзе пры затратах 400 млн руб. эфект ад асваення ў вытворчасці склаў 28 млрд руб., што амаль у 2 разы перавысіла затраты на ўсю аграрную навуку. Варта ўспомніць, што навука па эфектыўнасці ўкладваемых сродкаў лічыцца ва ўсім свеце найбольш эканамічна выгаднай дзейнасцю чалавека, зразумела, пры адпаведным рэсурсным забеспячэнні. На жаль, па вядомых прычынах яно ў апошнія гады не вытрымлівае крытыкі. Існуючыя аб'ёмы фінансавання і жорсткая падатковая палітыка згубна адбіваюцца на развіцці жыццёва важных накірункаў даследаванняў.

У мінулым годзе агульныя асігнаванні на навуку з бюджэту склалі 6,79 млрд руб., з якіх плацяжы ў бюджэт і ў пазабюджэтныя фонды склалі ў 3,76 млрд руб., або 55,4% (у т. л. падаткі — 1,4 млрд руб. і адлічэнні на сацыяльныя патрэбы — 2,11 млрд руб.). Асігнаванні за кошт цэнтралізаваных сродкаў Мінсельгасхарчу знаходзіліся на ўзроўні 1,12 млрд руб. Доля зарплаты ў структуры затрат навуковых устаноў склала толькі 34% пры сярэдняй зарплаце 68,7 тыс. руб., у той час як сярэдняя па рэспубліцы — 87 тыс. руб. Існуючая падатковая сістэма не стымулюе выкарыстанне навуковых дасягненняў у вытворчасці.

Ды як жа жыць і развівацца навуцы, калі больш за палову выдзяляемых сродкаў трэба вяртаць назад? Таму ў чарговы раз просім Кабінет Міністраў і Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь разгледзець і станоўча вырашыць пытанне пра адмену ўсіх відаў падаткаў, пошлін і збораў для навуковых устаноў, якія ўваходзяць у склад Акадэміі аграрных навук; распаўсюдзіць на навуковыя ўстановы акадэміі тарыфы па аплаце электраэнергіі, камунальных паслуг, якія вызначаны для бюджэтных арганізацый; павысіць узровень аплаты працы навуковых супрацоўнікаў да ўзроўню, які перавышае сярэднюю заработную плату інжынерна-тэхнічных работнікаў прамысловасці не менш чым на 50%, і павялічыць стыпендыі аспірантам і дактарам не менш чым у два разы.

Што датычыць сённяшніх падыходаў да вырашэння праблем вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, і ў прыватнасці сяўбы, то навука мае канкрэтныя прапановы. Сярод іх — пераход на энергазберагальныя севазвароты, выкарыстанне новых бактэрыяльных угнаенняў, сродкаў аховы раслінаў уласнай вытворчасці, назапашвання біялагічнага азоту ў глебе, прагрэсіўныя падыходы да вапнавання, якія дазваляюць скараціць дэфіцыт асноўных рэсурсаў мінімум на чвэрць, падтрымліваць узровень урадлівасці глебаў. Рэкамендацыі гэтага плана апублікаваны ў шэрагу нумароў рэспубліканскіх газет і выдадзены спецыяльнай брашурай.

Вытворчасць збожжа была і застаецца адной з важнейшых задач сельскай гаспадаркі рэспублікі, асабліва ў сучасны момант. Важна не дапусціць зніжэння ўраджайнасці і валавога збору, а гэта значыць пазбегнуць скарачэння пасяўных плошчаў. Асаблівую ўвагу неабходна надаць сартавой структурызацыі вытворчасці харчовага, фуражнага і тэхнічнага зерня. Вытворчасць мае дастатковую колькасць збожжавых культур, якія забяспечваюць атрыманне стабільных ураджаяў на ўзроўні больш за 3 т/га. Паляпшэнне структуры і павышэнне прадукцыйнасці шматгадовых траў на ворыве і пашах павінна забяспечвацца за кошт павелічэння долі бабовых і бабова-злакавых травастояў, што дазваляе адначасова вырашаць энергетычную і экалагічную праблемы.

Мэты бліжэйшай перспектывы вядзення сельскай гаспадаркі з улікам склаўшыхся рэалій ставяць перад навукай задачу: распрацаваць прынцыпы фарміравання сістэм земляробства прыстасавальна да аграландшафтаў з улікам мноства формаў гаспадарання. Акрамя больш гнуткай адаптацыі да прыродна-кліматычнага комплексу ў іх павінны знайсці вырашэнне задачы аптымізацыі севазваротаў, структуры ворных земляў, сістэм апрацоўкі глебы, угнаення і аховы раслінаў у залежнасці ад вытворчага патэнцыялу, формаў арганізацыі, пры абавязковым эканамічным і экалагічным кантролі.

Забеспячэнне пашыранага ўзнаўлення ўрадлівасці глебаў, ахова навакольнага асяроддзя — гэта асноватворная мэта і крытэрый ацэнкі гаспадарчай дзейнасці чалавека, вызначальная задача навуковых даследаванняў.

Галоўны аб'ектыўны тэст рацыянальнага вядзення земляробства — гэта стан урадлівасці зямлі, экалагічная, энергетычная і эканамічная мэтазгоднасць.

Патрабуюць свайго вырашэння праблемы стварэння пластычных сартоў і парод жывёл, біялагічных сродкаў, якія забяспечваюць устойлівую прадукцыйнасць і высокую канверсію пажыўных рэчываў, распрацоўкі

машын і абсталявання для вытворчасці і перапрацоўкі прадукцыі з нізкім энергарэсурсаспажываннем і высокай прадукцыйнасцю; фарміраванне эканамічнага механізма пастунальнага развіцця агракомплексу.

Не так даўно на жывёлагадоўчых комплексах і птушкафабрыках рэспублікі вытваралася 75% свініны, чвэрць ялавічыны, практычна ўся прадукцыя птушкагадоўлі. Вярнуць высокі ўзровень вытворчасці на іх, інтэнсіфікаваць яе — задача гэтых прадпрыемстваў і вучоных акадэміі. Першая праблема — паўнацэннае кармленне жывёлы, другая — забеспячэнне эколага-эканамічнай эфектыўнасці прамысловага тыпу вытворчасці.

Праблема энергарэсурсаспажывання з усёй вастрынёй паўстала перад усімі галінамі народнай гаспадаркі рэспублікі. І той падыход, які дыктуецца жыццём у плане зніжэння спажывання энерганосьбітаў, не ў поўнай ступені прымальны да сельскагаспадарчай вытворчасці. Інтэнсіфікацыя галін АПК (а гэта наш шлях, яго прайшлі развітыя дзяржавы) напрамую звязана са спажываннем вялікай колькасці энергіі. Гэта, зразумела, не азначае, што на сяле павінны атрымаць перавагу нядбайныя адносіны да энерганосьбітаў. Але іх павінна быць столькі, колькі трэба, і ў тэрмін. Без гэтага бадавочнае наступства — недабор прадукцыі. ЗША на вытворчасць харчовай кілакалорыі спажывае больш за 10 ккал выкапнёвай энергіі, а Беларусь — утрая менш. У нас недастатковы ўзровень перапрацоўкі сыравіны, шмат немеханізаванай, ручной працы. Адсюль нізкая яе прадукцыйнасць. Такая ж несуцяшальная і бліжэйшая перспектыва: з агульнай колькасці працуючых у сельскай гаспадарцы 40% пенсійнага ўзросту, а праз 3—5 гадоў удзельная вага гэтай катэгорыі ўзрасце. Хто ж будзе карміць людзей заўтра? Роля навукі ў вырашэнні гэтай праблемы вялікая.

Перад вучонымі-эканамістамі стаіць актуальная задача абгрунтавання рознічных цэн, у якіх доля першаснага вытворцы павінна складаць 60—70%, а гэта непасрэдна звязана з ліквідацыяй вялікага ліку пасрэднікаў.

Неабходна ўнесці распрацаваныя і ўзважаныя прапановы па стварэнні пры Міністэрстве цэнтра або падраздзялення аграрнага маркетынгу, які забяспечыць збор і размеркаванне інфармацыі пра аб'ёмы вытворчасці і цэны на сыравіну і прадукцыю, тым больш, што аснова для практычнай рэалізацыі гэтай задачы распрацавана Інстытутам эканомікі і інфармацыі.

Важнейшыя праблемы перад вытворцамі прадукцыі і навукай пастаўлены ў вобласці матывацыі працы, інтэграцыі суб'ектаў у інфраструктуры аграпрамысловага комплексу, іх прававой базе, энергарэсурсазабеспячэнні і інш.

Разумеючы фінансавую складанасць, у якой знаходзіцца аграрная навука, акадэмія ўносіць на абмеркаванне прапановы, якія накіраваны на выкарыстанне ўнутраных рэзерваў з мэтай выхаду з цяжкай сітуацыі. У першую чаргу гутарка ідзе пра ўдакладненне рэспубліканскай дзяржаўнай праграмы «Агракомплекс». Мэтазгодна выдзеліць і ўдакладніць важнейшыя прыярытэты і адпаведна ўпарадкаваць структуру навуковых, канструктарскіх і праектных устаноў, а таксама колькасны састаў абслугоўваючага персаналу. Трэба прызнаць, што ў гэтым накірунку ёсць над чым працаваць. Пра гэта ішла размова ў мінулым годзе на агульным сходзе, аднак рэальныя зрухі нязначныя.

Мы мяркуем, што і ў перспектыве мэтавая дзяржаўная навукова-тэхнічная праграма па развіцці АПК будзе займаць вядучае месца ў дзейнасці творчых калектываў і павінна быць прыярытэтнай. Але па змесце, глыбіні і пастаўленых канчатковых мэтах яна патрабуе ўдасканалення і якаснага змянення ў адрозненне ад сучаснай. У гэтай сувязі нам здаецца мэтазгодна, зыходзячы з усебаковага аналізу ўжо дасягнутага навукова-тэхнічнага ўзроўню, правесці экспертную ацэнку і інвентарызацыю наяўнага ў рэспубліцы навуковага задзелу для таго, каб выявіць і

вызначыць для даследаванняў ключавыя, абагульняючыя, інтэграваныя навуковыя накірункі, рэалізацыя якіх забяспечыць выкананне эканамічных і сацыяльных задач па развіцці аграпрамысловага комплексу.

Вырашэнню гэтых задач павінна быць падпарадкавана навукова-тэхнічная дзейнасць навуковых устаноў акадэміі, якую мэтазгодна сканцэнтраваць на важнейшых прыярытэтных накірунках даследаванняў, якія маюць генеральнае значэнне для развітых галін АПК. Такімі з'яўляюцца: урадлівасць глебаў і рацыянальнае выкарыстанне зямельных рэсурсаў, стварэнне на аснове дасягненняў біялагічных і іншых навук новых сартоў і гібрыдаў сельскагаспадарчых культур і парод жывёл; распрацоўка новых тэхналогій вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі і яе глыбокай і комплекснай перапрацоўкі, захавання якасных характарыстык прадуктаў харчавання.

Хацелася б асабліва падкрэсліць, што аператыўная і рознабаковая інфармацыя адносіцца да стратэгічных рэсурсаў навукі. Мінулы год у развіцці аграрнай навукі ў Беларусі характарызаваўся спадам інфармацыйнага забеспячэння. Бібліятэкі навукова-даследчых устаноў спынілі папаўненне сваіх рэсурсаў. Асноўныя прычыны — рэзкае скарачэнне выдання літаратуры ў Беларусі і ў калег з СНД, немагчымасць з-за фінансавых цяжкасцяў набываць літаратуру ў дальнім замежжы, «электронны занавес» паміж рэспублікай і цывілізаваным светам. Адсутнасць доступу да новай інфармацыі прывяла да зніжэння творчай актыўнасці даследчыкаў, паток заявак на дастаўку літаратуры з-за мяжы працягвае падаць. У прамой залежнасці ад узроўню інфармаванасці знаходзіцца канкурэнтаздольнасць даследаванняў. Працы інстытутаў з-за названых прычын і іх афармлення не маюць шырокага распаўсюджання, не выконваюць задачу навуковай камунікацыі. І ўсё ж нельга не адзначыць, што нягледзячы на немалыя цяжкасці, цэнтральная бібліятэка акадэміі паспяхова вырашае праблему доступу да нацыянальнай і сусветнай сельскагаспадарчай інфармацыі. Такі доступ магчымы пры выкарыстанні міжнародных баз даных ФАО (АГРІС), Нацыянальнай сельскагаспадарчай бібліятэкі ЗША (АГРІКОЛА), Цэнтральнай бібліятэкі Рассельгасакадэміі (АГРОС).

У канцы 1994 г. бібліятэка выіграла грант у Фондзе Сораса ў памеры 11 000 дал. і набыла базу даных Сельскагаспадарчага бюро брытанскай садружнасці (СІ ЭЙ БІ Інтэрнэшнэл) з рэфератамі з 10 тыс. лепшых сельскагаспадарчых часопісаў свету. Бібліятэка здольная прадставіць інфармацыю з 22 розных бібліяграфічных, рэфератыўных, поўнатэкставых і экспертных баз даных, у якіх змяшчаецца звыш 5 млн запісаў, і забяспечыць кожную навукова-даследчую распрацоўку звесткамі пра аналагі з сусветнай інфармацыйнай прасторы. Яна таксама забяспечвае перадачу інфармацыі, створанай у акадэміі, у сусветныя банкі даных, г. зн. ажыццяўляе адваротную сувязь.

Пры абмежаваных магчымасцях навукова-даследчым установам неабходна ў максімальнай ступені выкарыстоўваць гэтыя крыніцы інфармацыі. Новыя інфармацыйныя тэхналогіі на аснове праграмнага пакета «МАРК» ужо пачалі ўкараняць у шэрагу БелНДІ: аховы раслінаў, пладаводства, агародніцтва, сельскагаспадарчай радыелогіі. На парадак дня ўстала пытанне галіновай аўтаматызаванай сістэмы навукова-тэхнічнай інфармацыі. Неабходныя яе прадпасылкі ўжо створаны: ёсць доступ да сусветных баз даных, у кожнай навуковай установе ёсць напрацаваны шматгадовай дзейнасцю лакальны інфармацыйны патэнцыял, персанальным камп'ютэрам сёння не здзівіш нікога — у Беларусі ёсць надзейныя камп'ютэрныя сеткі тыпу БЕЛПАК. Застаецца толькі ўсё гэта аб'яднаць, каб максімальна наблізіць інфармацыю да рабочых месцаў даследчыкаў.

Мы абяцалі ў кароткі тэрмін прарабіць гэтую працу, зыходзячы з дакументаў, падпісаных на пасяджэнні Міждзяржаўнага савета па пытаннях аграрнай навукі і інфармацыі ў аграпрамысловым комплексе краін

садружнасці незалежных дзяржаў, ініцыятарам правядзення якога была наша рэспубліка ў ліпені мінулага года. Усім навуковым установам неабходна актыўна задзейнічаць наяўную электронную тэхніку для максімальнага выкарыстання назапашваемага ў цэнтры патэнцыялу.

Выклікае здзіўленне «беражлівы» падыход да эканоміі грашовых сродкаў. Асобныя навуковыя ўстановы ў бягучым годзе выпісалі ўсяго па 1—3 назвы часопісаў, у ліку якіх пераважаюць «Гаспадар», «Гаспадыня». Ствараецца ўражанне, што кіраўнікоў некаторых інстытутаў і станцый хвалюе не пытанне пераадолення тупіковай сітуацыі ў арганізацыі і забеспячэнні навуковага пошуку, павышэння метадычнага ўзроўню даследаванняў і канкурэнтаздольнасці, а толькі, прабачце, лёгкі шлях зніжэння артыкула «выдаткі».

Аграрная навука доўгія гады расла колькасна. Мы ганарыліся тым, што кожны чацвёрты вучоны свету — савецкі. Калі б колькасны рост суправаджаўся належным павелічэннем фінансавання, то гэта было б нармальнай з'явай. Зразумела, у пэўнай ступені бюджэтныя асігнаванні раслі, але іх павелічэнне ў асноўным забяспечвала толькі зарплату дадаткова прыцягнутаму персаналу, але не ўдасканаленне лабараторна-прыборнай і матэрыяльна-тэхнічнай базы, без развіцця якой нельга забяспечыць высокі ўзровень даследаванняў. Значыць, навука развівалася ў асноўным экстэнсіўна. У той жа час галіны народнай гаспадаркі інтэнсіфікаваліся. Дык ці не час і нам устаць на шлях інтэнсіфікацыі працы вучоных? Думаецца, у гэтым выпадку наша навука стане больш эфектыўнай. Заўважу, што такая перабудова складаная, але непазбежная, пры гэтым выключна важна не дапусціць памылак, паколькі за гэтым працэсам стаяць людзі высокай кваліфікацыі, на падрыхтоўку якіх патрэбна ад 15 да 20 гадоў, і вялікія грашовыя сродкі. У нас ужо ёсць некаторы вопыт у гэтай справе. У мінулым годзе мы аб'ядналі тры інстытуты акадэмічнага профілю. Наогул, можна сказаць, у выйгрышы апынуліся ўсе. Зараз галоўным для БелНДІ эканомікі і інфармацыі АПК, як, зрэшты, і для іншых навуковых устаноў, з'яўляецца павышэнне ўзроўню даследаванняў, якія забяспечваюць навуковае суправаджэнне пераўтварэнняў АПК і выключаюць практыку так дарага ўсім нам каштуючых метадаў проб і памылак.

Калі ўзяць за кропку адліку стварэнне Беларускага аддзялення УАСГНІЛ, то з 1991 г. колькасць працуючых у інстытутах акадэміі скарацілася на 1177 чалавек, або на 22%, у тым ліку навуковых супрацоўнікаў на 17%, з іх кандыдатаў навук — на 23%. Праца вучоных стала непрэстыжнай, аплата яе выклікае насмешку ў грамадстве.

За апошні час адзначаецца ўстойлівая небяспечная тэндэнцыя зніжэння падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі праз аспірантуру. Калі ў 1990 г. у ёй навучаліся 184 чалавекі, то ў сучасны момант — усяго толькі 121, або на 34% менш. Гэта значыць, што будучыня аграрнай навукі пад пагрозай, калі ўлічыць да таго ж яшчэ і тое, што асноўны састаў вучоных-аграрнікаў набліжаецца да пенсійнага ўзросту.

Такім чынам, без вырашэння задачы выбару шляхоў і спосабаў жыццязабеспячэння творчых калектываў акадэміі іх далейшы лёс бачыцца праблематычным.

Якія ўнутраныя рэзервы маюць установы акадэміі з тым, каб павысіць зарплату супрацоўнікам, стварыць нядрэнныя ўмовы для дзейнасці? Давайце спачатку прааналізуем складўшуюся сетку навуковых устаноў. Пачнём з абласных станцый. Іх у рэспубліцы пяць і адзін занальны Гродзенскі інстытут. З улікам рэгіянальных (занальных) асаблівасцяў яны неабходныя. Усяго ў іх працуюць 570 супрацоўнікаў. Па складўшайся традыцыі ім нададзены статус комплекснасці. Гэта навуковы «суверэнітэт» вобласці. У аснову яго стварэння пакладзены адміністрацыйны прынцып: «кожны горад каля ракі сабе будуе Лужнікі». Відаць, настаў час адмовіцца ад гэтага прынцыпу і кожнай установе неабходна вызначыць

галоўны пакірунак. Натуральна, мы тут вялікага скарачэння не атрымаем, але эфектыўнасць, бясспрэчна, павысіцца.

У рэспубліцы ёсць доследныя станцыі, якія могуць быць аб'яднаны або нават скарочаны без шкоды для справы. Гэта Палесская доследная станцыя ў Гомельскай вобл., дзе працуюць 70 чалавек, і Віцебская доследна-меліярацыйная, дзе працуе 14 чалавек. Гэта малаэфектыўныя ўстановы. Варта падумаць пра мэтазгоднасць іх існавання. Возьмем Палесскі комплексны меліярацыйны аддзел. Там працуюць 48 чалавек, у тым ліку 15 кандыдатаў навук, у асноўным інжынернага профілю. Ён ствараўся, калі на Палессі разгортваліся меліярацыйныя работы Галоўпалессеводбудам. У сучасны момант апошні пераарыентуе сваю працу, і ў ім можа знайсці сваё месца і названы аддзел.

У структуры акадэміі ёсць тры інстытуты, якія займаюцца праблемамі інжынернага забеспячэння тэхналагічных працэсаў. БелНДІ механізацыі сельскай гаспадаркі, БелНДІ энергетыкі і электрыфікацыі АПК, часткова Беларускі навукова-даследчы канструктарска-тэхналагічны інстытут мясной і малочнай прамысловасці. Пытаннямі механізацыі яшчэ займаюцца ў БелНДІ агародніцтва, акрамя таго — аддзел механізацыі і канструктарскае бюро ў БелНДІ меліярацыі і лугаводства. Усяго каля 700 чалавек. Ці не зашмат? Да таго ж БелНДІ механізацыі сельскай гаспадаркі размешчаны ў адным квартале Мінска з БАТУ. І ці не мэтазгодна было б на гатовай базе стварыць універсітэт механізацыі і энергетыкі?

Шырокае развіццё ў рэспубліцы атрымалі працы па селекцыі шмат якіх сельскагаспадарчых культур. У гэтай сферы працуюць каля 500 чалавек. Магчыма, і тут нам трэба вызначыць прыярытэты, засяродзіць на іх вырашэнні намаганні вядучых селекцыянераў рэспублікі.

Два гады таму БелНДІ меліярацыі і воднай гаспадаркі быў пераіменаваны ў БелНДІ меліярацыі і лугаводства. Мы разлічвалі на развіццё важнейшай галіны, якой з'яўляецца лугаводства, але гэтага не здарылася, ды і перспектыва, на жаль, не праглядаецца. Магчыма, мэтазгодна перадаць работы па лугаводству ў спецыялізаваны інстытут па гэтым профілі — БелНДІ земляробства і кармоў?

Акадэмія аграрных навук валодае багатай эксперыментальнай базай. У яе распараджэнні знаходзяцца 53 доследныя гаспадаркі, якія маюць 174 тыс. гектараў сельгасугоддзяў (у т. л. 122 тыс. га ворыва), што складае каля 2% ад рэспубліканскіх паказчыкаў. У гэтых гаспадарках атрымліваюць ад 2 да 5% збожжа, бульбы, мяса, малака, а таксама племянны маладняк буйной рагатай жывёлы, свіней, племянныя яйкі. Яны ў 1994 г. перавыканалі план вытворчасці насення эліты збожжавых культур, шматгадовых траў, бульбы. На жаль, элітны пасяўны матэрыял застаецца незапатрабаваным у поўнай ступені з-за адсутнасці сродкаў у гаспадарак, а базы ад гэтага нясуць вялікія страты. Не ўмацоўваецца і іх матэрыяльна-тэхнічная аснова, па ўзроўні свайго развіцця яны не падняліся вышэй за радавыя гаспадаркі. А доследныя ж гаспадаркі павінны быць эталонам вядзення вытворчасці на самым сучасным навукова-тэхнічным узроўні. Яны маюць права чакаць адпаведнай увагі і дапамогі ад Мінсельгасхарчу.

Мы таксама павінны ўважліва вывучыць сетку сваіх эксперыментальных баз і прыняць адпаведныя рашэнні па іх скарачэнні і ўдасканаленні. Жыццё дыктуе пошук формаў найбольш цеснага супрацоўніцтва вытворчасці з навуковымі ўстановамі акадэміі, патрабуе ўдасканалення сістэмы навукова-вытворчых аб'яднанняў.

На наш погляд, неабходна і структурная перабудова апарату Прэзідыума акадэміі. Выказваецца думка пра мэтазгоднасць мець у акадэміі толькі два аддзяленні: земляробства і раслінаводства; жывёлагадоўлі і ветэрынарнай медыцыны. Адсюль адпаведна павінны быць такія ж комплексныя праграмы навуковых даследаванняў. Гэтыя падраздзяленні, магчыма, павінны ўзначальваць віцэ-прэзідэнты, якія будуць несці ад-

казнасць за развіццё даследаванняў і навуковае забеспячэнне базавых галін сельскай гаспадаркі.

Некалькі слоў пра інтэграцыю навукі, адукацыі і вытворчасці.

Вышэйшыя навучальныя ўстановы сістэмы Мінсельгасхарчу валодаюць магутным навукова-педагагічным патэнцыялам, які складае палову ў аграпрамысловым комплексе. Тут працуюць 2 акадэмікі ААН Рэспублікі Беларусь, 5 членаў-карэспандэнтаў, 844 дактары і кандыдаты навук. Аднак гэтая інтэлектуальная сіла выкарыстоўваецца не ў поўную меру. Павысіць аддачу, на наш погляд, можна праз паглыбленне інтэграцыйных сувязяў навукі акадэмічнай і ВНУ. Падобныя ўзаемаўзбагачальныя сувязі вельмі эфектыўныя, паколькі дазваляюць больш рацыянальна выкарыстоўваць інтэлектуальны патэнцыял і матэрыяльныя рэсурсы. Грошы, укладзеныя ў гэтым выпадку ў навуку і адукацыю, забяспечаць не толькі атрыманне новых сартоў, парод і тэхналогій, але, што не менш важна, будуць садзейнічаць фарміраванню думаючай моладзі, здольнай працаваць у навуковых лабараторыях, карыстацца навейшымі тэхналогіямі і арганізацыйнымі мадэлямі ў вытворчасці.

Сімбіёз вышэйшай адукацыі і навукі павінен ісці, на наш погляд, па шляху стварэння на базе ВНУ і НДІ вучэбна-навукова-вытворчых цэнтраў. Такія прыклады ўжо ёсць не толькі ў далёкім замежжы, але і ў Расіі. Узяць, да прыкладу, Новасібірскі дзяржаўны аграрны універсітэт. Тут у адзіным комплексе працуюць кафедры, праблемныя і галіновыя лабараторыі ВНУ, НДІ акадэміі навук, вытворчыя філіялы лабараторый і кафедраў, базавыя гаспадаркі. Новасібірскія ВНУ выйшлі на прамыя сувязі з універсітэтамі развітых краін свету. Магутны навуковы патэнцыял дазволіў вучоным смела брацца за вырашэнне складаных тэарэтычных і вытворчых праблем. І галоўнае, навука тут з'яўляецца базай добрай падрыхтоўкі студэнтаў да самастойнай творчай дзейнасці.

Арганізацыя навуковых даследаванняў, адносіны да навукі прынцыповым чынам павінны змяняцца ва ўсёй сферы сельскагаспадарчай адукацыі. Калі гэтага не зрабіць, стагнацыйныя падыходы да адукацыі не змогуць забяспечыць падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў, здольных правесці радыкальныя рэформы на сяле, ды і ў самой навуцы.

Не выпадкова важнай арганізацыйнай асаблівасцю вышэйшай адукацыі ў Паўночнай Амерыцы з'яўляецца тое, што 60% часу прафесарска-выкладчыцкага саставу ідзе на навуку і 40% — на навучальны працэс. На думку спецыялістаў, удзел выкладчыкаў у навуковых даследаваннях, вучобе, аказанні дапамогі вытворчасці ўзбройвае іх саміх сучаснымі навуковымі ведамі, на аснове якіх ідзе навучанне будучых спецыялістаў, а ўдзел ва ўкараненні дазваляе актыўна выяўляць узнікаючыя праблемы ў сельскагаспадарчай практыцы, шукаць шляхі іх вырашэння. Гэта стварыла тую самую структурную сувязь навука—адукацыя—вытворчасць, якая забяспечвае амерыканскай сельскай гаспадарцы высокія тэмпы развіцця, а сістэму вышэйшай адукацыі робіць гнуткай і жыццяздольнай.

На жаль, даводзіцца адзначаць, што ў крызіснай сітуацыі эканомікі значна знізіўся попыт на інтэлектуальную і матэрыялізаваную прадукцыю вучоных акадэміі, хаця іх масавае выкарыстанне ў вытворчасці забяспечвае значны прырост прадукцыі практычна без капітальных і вялікіх фінансавых затрат. Дарэчы тут нагадаць народную мудрасць: без навукі сялянскія рукі, што без насення зямля. І ў якім бы крызісным стане ні была эканоміка рэспублікі, такога становішча дапускаць нельга.

У Беларусі пераважаюць буйныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы з адпаведнай матэрыяльна-тэхнічнай базай, якія маюць лепшыя прадпасылкі гаспадарання і патрабуюць навуковага забеспячэння. Аднак сама сельскагаспадарчая навука церпіць інфармацыйны, прыборны і фінансавы голад. Пераадоленне яго бачыцца ў накірунку гаспадарчага стымулявання інтэлектуальнай працы, яе прававой і сацыяльнай абароне, стабільнага фінансавання; запатрабавання вытворчасцю навуковых ведаў шляхам гнуткай падатковай палітыкі па ўкараняемых пазі-

цыях; павышэння метадычнага і інфармацыйнага ўзроўню, шырокай рэкламы навуковай прадукцыі.

У кантэксце аграрнай рэформы павінна ісці развіццё сістэмы адукацыі, мэтай удасканалення якой з'яўляецца фарміраванне высокапрафесійнага сельскага працаўніка на аснове дасягненняў айчыннай навукі, практыкі і сусветнай цывілізацыі ў наступных накірунках: стварэнне бесперапыннай шматузроўневай сеткі аграрнага навучання; інтэграцыя навукі, адукацыі і вытворчасці, узмацненне практычнага навучання; стварэнне сеткі кансультатыўных і ўкараняльных цэнтраў, забеспячэнне «канвертуемасці» дыплома.

Рэальна забяспечыць вырашэнне дадзенай задачы магчыма толькі ў рамках зараз функцыянуючага Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчовых тавараў, а ні ў якім разе не ў розных ведамасных структурах або ў іншай сістэме, як гэта прадугледжваецца праектам рашэння Кабінета Міністраў, прадстаўленым на ўзгадненне Міністэрствам адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь.

Што ж датычыцца рэфармавання і ўпарадкавання ўстаноў аграрнай адукацыі, то яны бачацца ў накірунку ўдакладнення аб'ёмаў падрыхтоўкі кадраў, асабліва масавых прафесій, абнаўлення пераліку спецыяльнасцяў і спецыялізацый, скарачэння дубліруючых тэрытарыяльна і функцыянальна арганізацый.

Ва ўмовах развіцця рыначных адносін важнае месца ў жыцці навуковых калектываў пачынаюць займаць камерцыйныя падыходы. За мінулы перыяд ужо назапашаны нейкі вопыт. Ён патрабуе глыбокай ацэнкі, адпаведных высноў, што і будзе зроблена Прэзідыумам акадэміі. Але ўжо сёння можна сказаць, што гэты працэс будзе развівацца і далей. Ён дазваляе пашыраць магчымасці аплаты працы навуковых супрацоўнікаў, умацоўваць сувязь з вытворчасцю. Разам з тым дзейнасць камерцыйных структур пры адсутнасці дакладнага заканадаўства па ахове інтэлектуальнага прадукту і дзяржаўнай маёмасці на творчую прадукцыю будзе стрымлівацца.

Акадэмія аграрных навук у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 1992 г. з'яўляецца вышэйшым рэспубліканскім цэнтрам па развіцці аграрнай навукі і нясе поўную адказнасць за навуковае забеспячэнне аграпрамысловага комплексу рэспублікі, г. зн. выконвае дзяржаўныя функцыі. Аднак у разрад дзяржслужачых работнікі апарату, якія непасрэдна ажыццяўляюць гэтую працу, чамусьці не ўключаюцца. Мы не атрымалі пераканаўчага адказу на гэтае пытанне ад Кабінета Міністраў.

На заключэнне хацелася б сказаць, што ў мінулым годзе важнейшай задачай Прэзідыума, кіраўнікоў навуковых устаноў акадэміі было захаванне навуковых калектываў, іх матэрыяльна-тэхнічнай базы, выкананне праграмы «Агракомплекс». Можна канстатаваць, што, нягледзячы на ўсе цяжкасці, з якімі сустракалася аграрная навука, мы не разгубілі свой асноўны патэнцыял, не дапусцілі разбурэнняў калектываў. У асноўным выкананы планы навукова-даследчых работ.

У той жа час з вялікай заклапочанасцю хачу выказаць агульную думку вучоных-аграрнікаў пра тое, што добра развітая сельскагаспадарчая навука рэспублікі знаходзіцца ў крытычным стане. Толькі надзвычайныя меры могуць упярэчыць яе развал. Для аднаўлення ж страчанага спатрэбяцца вялікія затраты і доўгія гады.